УДК 94(476)

**К. Д. Ананька**
Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», вул. Ажэшка, 22, 230023 Гродна, Рэспубліка Беларусь; дзяржаўная ўстанова адукацыі «Гімназія № 7 імя В. Ц. Калакольнікава г. Гродна», пр-т Касманаўтаў, 38б, 230003 Гродна, Рэспубліка Беларусь, +375 (29) 807 89 96, kirixan@yandex.ru

## УТВАРЭННЕ БЕЛАРУСКІХ ГІМНАЗІЙ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ НА РУБЯЖЫ 1910—1920-Х ГАДОЎ

У артыкуле разглядаецца дзейнасць беларускіх актывістаў і арганізацый па адкрыцці сярэдніх навучальных устаноў — беларускіх гімназій. Акцэнтуецца ўвага як на агульных, так і на прыватных абставінах арганізацыі нацыянальнай сярэдняй адукацыі на тэрыторыі міжваеннай Заходняй Беларусі. На аснове прааналізаваных крыніц аўтар зрабіў спробу выявіць асаблівасці іх утварэння і ўмовы функцыянавання ў першыя гады дзейнасці. Упершыню ў беларускай гістарыяграфіі ўздымаецца тэма нерэалізаваных праектаў беларускіх гімназій у мястэчках Свір, Шаркаўшчына, гарадах Глыбокае і Пінск. Робіцца выснова аб цяжкіх умовах арганізацыі беларускіх гімназій, падкрэсліваецца дзейнасць беларускіх арганізацый, жаданне мясцовага насельніцтва, геаграфічны фактар, матэрыяльныя і фінансавыя праблемы, праблемны ўплыў уладаў у гэтым пытанні.

**Ключавыя словы:** беларускія гімназіі; сярэдняя школа; Заходняя Беларусь; міжваенны час; установы адукацыі.

Бібліягр.: 35 назваў.

**K. D. Ananka**
Institution of Education “Yanka Kupala State University of Grodno”, 22 Azheshko Str., 230023 Grodno, the Republic of Belarus, State Educational Institution “Gymnasium No. 7 named after V. T. Kolokolnikov, Grodno”, 38b Kosmonavtov Ave., 230003 Grodno, the Republic of Belarus, +375 (29) 807 89 96, kirixan@yandex.ru

## CREATION OF BELARUSIAN GYMNASIUMS IN WESTERN BELARUS AT THE TURN OF THE 1910—1920S

The article deals the activities of Belarusian activists and organizations to open secondary educational institutions — Belarusian gymnasiums. Attention is focused on both general and specific circumstances of the organization of national secondary education in the territory of interwar Western Belarus. Based on the analysed sources, the author made an attempt to establish the peculiarities of their formation and conditions of functioning in the first years of their activity. For the first time in Belarusian historiography the author raises the issue of unrealized projects of Belarusian gymnasiums in the towns of Svir, Sharkovshchina, Hlubokoje and Pinsk. The conclusion is made about the difficult conditions of the organization of Belarusian gymnasiums; the activities of Belarusian organizations, the desire of the local population, the geographical factor, material and financial problems, and the problematic influence of the authorities in this matter are emphasized.

**Key words:** Belarusian gymnasiums; secondary school; Western Belarus; interwar period; educational institutions.

Ref.: 35 titles.

**Уводзіны.** На працягу доўгага часу адукацыя з’яўляецца важным элементам у станаўленні свядомай асобы, правадніком у прасоўванні нацыянальнай ідэі. У пачатку XX стагоддзя адбываўся працэс паступовага наладжвання беларускай культурна-асветніцкай справы, фарміраваліся асновы для стварэння нацыянальных школ. Аднак пасля Першай сусветнай вайны тэрыторыя Заходняй Беларусі загразла ў «палітычным беспарадку». Змена ўлады на працягу 1918—1921 гадоў значна ўплывала на арганізацыю беларускай адукацыі. У гэты час

© Ананька К. Д., 2024

беларускія актывісты пастараліся наладзіць сістэму ўласнай нацыянальнай сярэдняй адукацыі каб даць магчымасць навучацца на роднай мове, выхоўваць моладзь у патрыятычным духу. Менавіта беларускія гімназіі, якія дзейнічалі ў Вільні, Навагрудку, Гродне, Гарадку, Нясвіжы, Радашковічах і Клецку, сталі цэнтрамі падрыхтоўкі маладога пакалення.

Мэтай дадзенага даследавання стала выяўленне асаблівасцей утварэння беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі ва ўмовах польска-савецкай вайны і наступных палітычных і тэрытарыяльных зменах. У адпаведнасці з пастаўленай мэтай былі вызначаны наступныя задачы: 1) ахарактарызаваць умовы арганізацыі беларускай сярэдняй адукацыі ў разглядаемы перыяд; 2) выявіць прычыны правалу рэалізацыі шэрагу праектаў стварэння беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі; 3) прааналізаваць дзейнасць беларускіх актывістаў, арганізацый і мясцовага насельніцтва ў спробах арганізацыі ўласных сярэдніх школ.

**Матэрыялы і метады даследавання.** У сучаснай беларускай гістарыяграфіі тэма ўтварэння беларускіх гімназій не раскрыта ў поўнай меры. Умовы існавання сярэдніх беларускіх установ адукацыі ў міжваеннай Заходняй Беларусі закраналі ў сваіх працах былыя іх выпускнікі А. Чэмер (сапраўднае прозвішча — А. Анішчык), С. Новік-Пяюн і даследчыкі А. Вабішчэвіч, А. Чарнякевіч, М. Казлоўскі, В. Крывуць, А. Адамковіч. Асноўнымі крыніцамі даследавання сталі дакументы Літоўскага цэнтральнага дзяржаўнага архіва і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь. Не менш важным стаў пошук адпаведнай інфармацыі ў беларускай міжваеннай прэсе. Таму ў крыніцавую базу былі ўключаны перыядычныя выданні «Беларускае слова», «Наша думка», «Асьвета», «Наша праўда» і інш.

У аснове даследавання ляжалі агульнанавуковыя метады: аналіз, сінтэз і параўнанне. Таксама пры вывучэнні праблемы выкарыстоўваліся спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-храналагічны, гісторыка-сістэмны і гісторыка-генетычны.

**Вынікі даследавання і іх абмеркаванне.** Ідэя заснавання беларускай сярэднеадукацыйнай установы ў Вільні ўзнікла восенню 1918 года. На сходзе Віленскай беларускай рады ў снежні 1918 года пры дапамозе Беларускага таварыства дапамогі ахвярам вайны (БТДАВ) было прынята рашэнне заснаваць беларускую гімназію ў Вільні [1, с. 119]. У сувязі з адыходам нямецкіх войскаў быў зроблены запыт у Літоўскую Тарыбу з просьбай дазволіць адкрыць гімназію з беларускай мовай навучання. Галоўным ініцыятарам выступіў І. Луцкевіч, адзін з членаў БТДАВ. У выніку Міністр асветы часовага літоўскага ўрада М. Біржышка 4 студзеня 1919 года задаволіў просьбу віленскіх беларускіх дзеячаў, а Рада Літоўскай праваслаўнай епархіі пагадзілася перадаць у карыстанне будынак былога базыльянскага манастыра (Базыльянскія муры) па адрасе: вул. Вастрабрамская, № 9. Афіцыйна заняткі ў 1-й Віленскай беларускай гімназіі (далей — ВБГ) пачаліся 1 лютага 1919 года, а першым дырэктарам стаў М. Кахановіч [2, с. 43; 3].

Адначасова з наладжваннем навучальнага працэсу пачаліся палітычныя пераўтварэнні, якія паўплывалі на работу гімназіі. Пасля ўтварэння Літоўска-Беларускай ССР (Літбел) у лютым 1919 года савецкія школьныя органы зрабілі спробу адабраць будынак манастыра ў гімназіі і стварыць там музеі: гістарычны, этнаграфічны, заалагічны і інш. Дзеля гэтага ВБГ была падзелена на дзве «працоўныя» школы: вышэйшую, якую ўзначаліў функцыянер Народнага камісарыята асветы і культуры І. Ёнінас, і ніжэйшую, пад кіраўніцтвам дырэктара М. Кахановіча. План па вызваленні будынка ад гімназіі так і не быў здзейснены з-за распачатай польска-савецкай вайны. 19 красавіка 1919 года польскія войскі занялі Вільню. Да 24 ліпеня 1920 года ўстанова знаходзілася пад кантролем акупацыйнага органа — Грамадзянскага ўпраўлення Усходніх зямель [3, с. 3].

Вясной 1919 года ў Навагрудку мясцовы Бацькоўскі камітэт пад кіраўніцтвам настаяцеля кафедральнага сабора В. Бабкоўскага дабіўся адкрыцця Прыватнай змешанай гімназіі з рускай мовай выкладання, якая размяшчалася па адрасе: Рынак, № 37. Першым дырэктарам

быў абраны Р. Пяцэвіч. З 1921 года пасля прыходу новага дырэктара Я. Цеханоўскага ў адукацыйны працэс пачало ўводзіцца выкладанне на беларускай мове. У справаздачы гімназіі ад 30 лістапада 1923 года падкрэслівалася, што навучанне на рускай мове вядзецца ў 4—8 класах, а на беларускай — у 1—3-х класах. Апошні выпуск рускамоўнага класа адбыўся ў 1927 годзе, з гэтага ж года ўстанова была перапрафіліравана ў Навагрудскую беларускую гімназію (НБГ) [4, с. 9—10; 5, арк. 120, 302].

На працягу акупацыйнага перыяду вясны 1919 — лета 1920 года беларускія ўстановы амаль не атрымлівалі ніякага фінансавання. Кіраўніцтва ВБГ звярталася ў Генеральны камісарыят Усходніх зямель з просьбай фінансавай падтрымкі на 1919/1920 навучальны год [6, арк. 63—64]. Адначасова польскімі нацыяналістычнымі коламі была разгорнута кампанія супраць дзейнасці гімназіі. Напрыклад, прадстаўнік Нацыянальна-дэмакратычнай партыі Польшчы У. Студніцкі змог правесці рэзалюцыю на народных сходах і ў магістраце па адбіранні будынка Базыльянскіх муроў у ВБГ. Распачатае контрнаступленне Чырвонай арміі падарвала намер польскіх эндэкаў. Прысутнасць савецкіх войскаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі летам 1920 года ніякім чынам не паўплывала на працу гімназій. Кароткае знаходжанне Вільні ў складзе Літоўскай Рэспублікі ў жніўні—кастрычніку 1920 года магло ў пэўным сэнсе палепшыць працу ВБГ у сувязі з прынятым літоўскімі ўладамі законам аб падтрымцы адукацыйных устаноў іншых нацыянальнасцей. Чарговае наступленне польскага войска і стварэнне Сярэдняй Літвы сталі пагрозай для існавання культурна-асветніцкіх устаноў беларусаў, бо да канца 1920 года прымусова былі зачынены да 90 % беларускіх школ, у тым ліку Будслаўская беларуская гімназія (зачынена ў кастрычніку 1919 года) [1, с. 122; 3, с. 3].

У разгар польска-савецкай вайны актывізавалася дзейнасць па стварэнні сярэдняй навучальнай установы ў Гродне. Захады па арганізацыі беларускай гімназіі рабіліся яшчэ восенню 1919 года. Вядома, што ў Цэнтральную беларускую раду Віленшчыны і Гродзеншчыны былі накіраваны заявы ад 20 населеных пунктаў Гродзенскага павета аб адкрыцці беларускіх школ [7, с. 5]. Аднак польскі школьны інспектар Р. Вазнякоўскі адмовіў у задавальненні гэтых просьбаў. Тады стаўка была зроблена на адкрыццё беларускай сярэдняй навучальнай установы ў Гродне. Намаганнямі гродзенскага Беларускага нацыянальнага камітэта, Беларускага настаўніцкага саюза і Грамады беларускай моладзі ў Гродне ўдалося дамовіцца з гарадскім магістратам аб выдзяленні будынка былога Пушкінскага вучылішча па вул. Сафійскай для гімназіі і беларускага дзіцячага прытулку [8]. У выніку была арганізавана 4-класная гімназія пры дзіцячым прытулку. Аднак праз кароткі час Р. Вазнякоўскі выселіў адтуль беларускую ўстанову, а будынак быў перададзены пад пачатковую школу манашак-назарэцянак [9, с. 1].

Новыя мерапрыемствы па адкрыцці гімназіі ў Гродне пачаліся ў кастрычніку 1920 года. Ставілася мэта ўтварэння беларускай сярэдняй школы ў рэгіёне, у якой маглі б навучацца дзеці бедных слаёў насельніцтва. Таксама планавалася пры гімназіі стварыць бясплатны або танны інтэрнат. Усю работу па арганізацыі беларускай асветы ў горадзе вяла Беларуская школьная рада Гродзеншчыны, якая знаходзілася па адрасе: вул. Ажэшка, № 28. Верагодна, што некаторы час Гродзенская беларуская гімназія размяшчалася ў гэтым будынку. Ёсць таксама меркаванне, што адразу пасля адкрыцця ўстанова знаходзілася ў гродзенскім архірэйскім доме. Аднак у выніку дзіцячы прытулак быў перанесены ў сцены Барысаглебскага манастыра па вул. Фабрычнай (канцэлярыя гімназіі знаходзілася па адрасе: вул. Маставая, 9) [10, с. 6; 11, с. 2], які існаваў на месцы сучаснага драматычнага тэатру. У гродзенскай газеце «Беларускае слова» адзначалася, што «будынкі гэтыя вымагаюць значнага рамонту, для якога прытулак ня мае ніякіх грашовых спосабаў» [12, с. 2]. Намаганнямі Б. Тарашкевіча і В. Іваноўскага 29 лістапада 1920 года распачала сваю дзейнасць 1-я Гродзенская беларуская гімназія [8]. Перад адкрыццём, як указвалася ў прэсе, на навучанне ва ўстанове запісалася больш за 200 чалавек [11, с. 2]. Першым дырэктарам быў прызначаны мясцовы настаўнік і грамадзкі дзеяч П. Тамашчык. Адразу пасля адкрыцця гімназія сутыкнулася з шэрагам праблем. Галоўнымі з іх сталі адсутнасць фінансавых сродкаў на пастаяннае памяшканне для ўстановы і арганізацыі інтэрната для дзяцей, недастатковая матэрыяльная база для навучання [13, с. 2].

Прыкладна ў той жа час (у лістападзе 1920 года) пачала дзейнасць 4-класная беларуская гімназія ў мястэчку Гарадок Вілейскага павета. На жаль, засталося няшмат звестак аб пачатковым функцыянаванні гэтай установы. Вядома, што гімназія была адкрыта па ініцыятыве мясцовага насельніцтва, якое жадала навучацца на беларускай мове. Канцэсію атрымаў К. Тышкевіч, ён жа стаў дырэктарам. Дзейнасць гімназіі каардынавала Цэнтральная беларуская школьная рада (далей — ЦБШР), аб чым сведчаць лісты са справаздачамі. Адразу пасля адкрыцця ўстанова набыла статус прыватнай, за навучанне бралася плата, навучальна-выхаваўчы працэс быў арганізаваны на аснове праграм ВБГ. З-за фінансавых цяжкасцей у 1923—1924 гадах кіраўніцтва спрабавала перанесці гімназію ў Валожын і Глыбокае. Аднак польскія школьныя ўлады не дазволілі гэта зрабіць [14, с. 34—35].

Пасля заключэння Рыжскай мірнай дамовы ў сакавіку 1921 года і канчатковага ўваходжання заходнебеларускіх зямель у склад Польскай рэспублікі беларусы, нягледзячы на іх пераважную колькасць у заходнебеларускім рэгіёне, сталі ідэнтыфікавацца новымі ўладамі як этнічная меншасць. У адпаведнасці з канстытуцыйным абавязацельствам польская дзяржава брала на сябе адказнасць у прадастаўленні гарантый свабоднага развіцця мовы, культуры і рэлігіі мясцовага насельніцтва, а таксама ў галіне падтрымкі нацыянальная адукацыі [15, с. 18]. Беларускія гімназіі з'яўляліся прыватнымі ўстановамі адукацыі і практычна ніякай фінансавай падтрымкі ад дзяржавы ў пачатку 1920-х гадоў не атрымлівалі. Фактычна фінансавае ўтрыманне беларускіх гімназій ускладалася на плечы бацькоў навучэнцаў.

На падобным прынцыпе, як і НБГ, у свой час была заснавана беларуская гімназія ў Нясвіжы. Да пачатку 1921 года ў горадзе працавалі дзве прыватныя рускія гімназіі — мужчынская і жаночая. На базе апошняй і была створана беларуская гімназія. Пасля канчатковага прыходу польскіх улад дырэктар К. Счасновіч і канцэсіянер Ю. Жаўняркевіч з мэтай захавання ўстановы заснавалі на 1921/1922 навучальны год першыя два змешаныя класы з беларускай мовай навучання. Вялікую ролю ў гэтым адыграў кіраўнік школьнага хору Я. Шнаркевіч, па ініцыятыве якога сталі выкладаць на беларускай мове і ў іншых класах. На працягу навучальнага году гімназія фактычна была пераведзена ў статус коадукацыйнай — установы сумеснага навучання хлопчыкаў і дзяўчынак. Аднак афіцыйна ніякага дазволу на гэта атрымана не было. Акрамя таго, гімназія не мела ўласнага будынку, класы даводзілася размяшчаць у прыватных кватэрах і дамах па вул. Альбянскай [16, с. 5].

Летам 1924 года з-за складаных адносін з мясцовымі ўладамі было вырашана перанесці гімназію ў Клецк. Канцэсію на яе атрыманне здабыў ужо згаданы Я. Шнаркевіч. У пачатку верасня 1924 года распачала працу 7-класная Клецкая беларуская гімназія, якая змясцілася па адрасе: вул. Цэпэрская, № 37 (пазней установа будзе месціцца па адрасе: вул. Татарская, № 4). Дырэктарам прызначаны былы кіраўнік адной з павятовых школ В. Бараноўскі [17, с. 4]. Узніклі праблемы паміж Я. Шнаркевічам і польскімі ўладамі, якія вымусілі змяніць канцэсіянера. Пасля звароту да Куратара Палескай школьнай акругі ім стаў беларускі паланафіл А. Якімовіч, а новым дырэктарам установы прызначаны Ф. Акінчыц, былы кіраўнік пачатковай школы ў в. Засулле Стаўбцоўскага павета. Аднак на гэтай пасадзе ён прабыў нядоўга. Прыкладна ў пачатку 1925 года дырэктарам стаў Р. Якубёнак. Таксама змянілася назва ўстановы. З гэтага часу яна стала называцца Прыватнай 8-класнай змешанай беларускай гімназіяй ў Клецку прыродазнаўча-матэматычнага тыпу [18, арк. 13, 13 адв].

У 1921 годзе ў Радашковічах дзейнічала Беларускае рэальнае вучылішча пад кіраўніцтвам А. Крачкоўскага, на базе якога ўзнікла Радашковіцкая беларуская гімназія. У запыце Педагагічнай рады да Куратара Навагрудскай школьнай акругі аб дазволе на правядзенне заняткаў у новым 1921/1922 навучальным годзе падкрэслівалася, што ва ўстанове арганізавана пяць класаў, якія налічвалі 87 навучэнцаў і 6 выкладчыкаў. Навучанне ў малодшых класах вялося на беларускай мове, у старэйшых — на рускай. Школьныя ўлады маглі даць на гэта дазвол толькі пры наяўнасці пэўнай дакументацыі з пацверджанай кваліфікацыяй і грамадзянствам супрацоўнікаў вучылішча. Умяшацца ў гэтую справу прыйшлося Тава-

рыству беларускай школы (далей — ТБШ) у Радашковічах. На сходзе арганізацыі 10 кастрычніка 1921 года было вырашана ўзяць пад апеку ўстанову і рэарганізаваць яе ў Беларускую гімназію ў мястэчку Радашковічы. Канцэсіянерам выступіў старшыня А. Уласаў. 20 кастрычніка 1921 года Куратару Навагрудскай школьнай акругі была пададзена дэкларацыя аб намеры арганізаваць беларускую сярэднюю навучальную ўстанову [19, арк. 1—10].

На працягу лістапада—снежня 1921 года Радашковіцкае ТБШ вяло перамовы з польскімі школьнымі ўладамі. Апошнія адмовіліся зацвердзіць А. Уласава ў якасці дырэктара гімназіі з-за адсутнасці адпаведнай кваліфікацыі. У адказ на гэта было прапанавана тры кандыдатуры: Ф. Стэцкевіч, настаўнік гісторыі і латыні; В. Гаянкова, настаўніца геаграфіі і французскай мовы, былая загадчыца прагімназіі; Г. Гутаровіч, настаўнік матэматыкі і фізікі. Пасля чарговай адмовы ТБШ прапанавала прызначыць у якасці часовага кіраўніка гімназіі дырэктара НБГ Я. Цеханоўскага, які адпавядаў кваліфікацыйным патрабаванням. Аднак і гэту кандыдатуру таксама адхілілі. Толькі 10 сакавіка 1922 года Куратарыюм Навагрудскай школьнай акругі зацвердзіў кандыдатуру ксяндза Ф. Абрантовіча на пасаду дырэктара Радашковіцкай 8-класнай беларускай гімназіі імя Францыска Скарыны [19, арк. 29, 30, 48, 51, 52]. Будынак установы размясціўся на рагу вул. Мінскай і Касцёльнай плошчы [20, с. 5].

З паступовым наладжваннем структуры дзяржаўнай сістэмы адукацыі беларускія гімназіі ўвайшлі ў прамое падпарадкаванне мясцовых школьных улад. Пастановай Міністра рэлігійных веравызнанняў і публічнай асветы ад 3 мая 1922 года былі ўтвораны Палеская, Беластоцкая, Валынская, Варшаўская і Віленская школьныя акругі [21]. Пад упраўленне апошняй увайшлі Віленская, Гарадоцкая і Радашковіцкая гімназіі, а Навагрудская і Клецкая ўвайшлі ў склад Палескай школьнай акругі. Аднак 24 лютага 1927 года была выдадзена пастанова аб змяненні межаў Беластоцкай, Палескай і Віленскай школьных акруг. Згодна з ёй з 1 красавіка 1927 года з Палескай і Беластоцкай акруг вылучалася тэрыторыя Навагрудскага ваяводства, якая з гэтага часу трапляла пад юрысдыкцыю віленскіх школьных улад [22, с. 180]. Адпаведна з гэтым Навагрудская і Клецкая гімназіі ўвайшлі ў склад Віленскай школьнай акругі.

У канцы лютага 1921 года на пасяджэнні ЦБШР у Вільні быў узгоднены праект культурна-асветніцкай арганізацыі ТБШ, статут якой 1 ліпеня 1921 года зацвердзіў дэпартамент унутраных спраў Сярэдняй Літвы. Асноўнай задачай дзейнасці ТБШ з'яўлялася стварэнне новых і падтрымка ўжо існуючых беларускіх школ [23, с. 86]. 7 верасня 1921 года Цэнтральная школьная рада ТБШ паведаміла дэпартаменту асветы Сярэдняй Літвы аб перадачы ВБГ ва ўласнасць таварыства [2, с. 44]. Відавочным аказалася, што ў большасці сваёй у Галоўную ўправу ТБШ увайшлі педагогі гімназіі, таму і фінансавая падтрымка аказвалася пераважна гэтай установе.

Кожная беларуская гімназія павінна была мець уласны статут. Захаваўся Статут ВБГ, праект якога 30 сакавіка 1924 года дырэктар ВБГ Р. Астроўскі накіраваў у ЦБШР. У дакуменце галоўным чынам акрэсліваліся наступныя моманты: палажэнне, правы і структура школы. Паводле зместу статута ўнутранымі справамі ўстановы кіраваў дырэктар, а агульнымі — ЦБШР, якая адказвала за вырашэнне фінансавых пытанняў. Педагагічная рада займалася пытаннямі навучальнага працэсу. У яе ўваходзілі ўсе педагогі, лекар, старшыні ЦБШР і Бацькоўскага камітэта.

Бацькоўскія камітэты дзейнічалі амаль пры кожнай беларускай гімназіі. Яны з'яўляліся важнымі элементамі ў гімназічных структурах. Так, члены камітэта маглі выбіраць дырэктараў, на сходах вырашаць пытанні атрымання канцэсій. У канцы 1920-х гадоў Бацькоўскія камітэты ўзялі сярэднія ўстановы пад фінансавую апеку [6, арк. 90, 91 адв].

Дырэктар Р. Астроўскі 10 мая 1924 года накіраваў у Цэнтральную школьную раду ТБШ запыт з прапановай рэарганізацыі ўстановы з 8-класнай сярэдняй установы ў 4-класную другой ступені (у асноўным старэйшыя класы). На яго думку, утрыманне паўнавартаснай сярэдняй школы абыходзіцца вельмі дорага як канцэсіянерам, так і бацькам навучэнцаў. Да таго ж не ўсе класы былі напоўненымі. Таксама існавалі дзяржаўныя школы з бясплатным навучаннем. Затрачаныя марна рэсурсы Р. Астроўскі прапаноўваў накіраваць на арганізацыю і падтрымку пачатковых беларускіх школ у правінцыях, што ў будучыні дасць магчымасць

гімназіі атрымаць «здаровы нацыянальна беларускі элемент». Рэфармаванне ВБГ, на яго думку, павінна быць паступовае, разлічанае на 2—3 гады [6, арк. 70—77 адв]. Верагодна, прычынай гэтаму стала тое, што вялікая колькасць яўрэяў, якія складалі аснову вучнёўскага кантынгенту гімназіі у пачатку 1920-х гадоў, сталі масава пакідаць установу. Аднак прапанова Астроўскага не атрымала падтрымкі ў ТБШ.

Беларускімі нацыянальнымі арганізацыямі, у асаблівасці ЦБШР, а пазней і ТБШ, рабіліся неаднаразовыя захады па адкрыцці гімназій у іншых гарадах і мястэчках. Планы заснавання новых беларускіх гімназій не былі шырока распаўсюджаны. Магчыма, першым нерэалізаваным праектам з’яўляецца спроба адкрыцця беларускай гімназіі ў мястэчку Свір Свянцянскага павета восенню 1920 года ва ўмовах польска-савецкай вайны. Вядома, што прадстаўнік гімназіі наведваў ЦБШР у Вільні. Аднак мясцовы камендант не дазволіў адкрыць Свірскую беларускую гімназію [24, с. 2]. У пачатку 1921 года была зроблена яшчэ адна спроба арганізацыі навучальнай установы на поўначы Заходняй Беларусі. Так, па жаданні мясцовых жыхароў планавалася адкрыць беларускую гімназію ў мястэчку Шаркаўшчына Дзісненскага павета. Арганізатарам выступіў мясцовы настаўнік І. Балай, які і павінен быў стаць яе дырэктарам. З гэтай мэтай было сабрана больш за 60 заяў мясцовых жыхароў. Прыкладна ў студзені 1921 года І. Балай прыязджаў у Вільню, магчыма, ва ўправу ТБШ. Планавалася, што 5-класная Шаркаўшчынская беларуская гімназія будзе знаходзіцца ў будынку мясцовай народнай школы, а ўтрымлівацца — за кошт вучняў [25, с. 6; 26, с. 6]. Відавочна, што гімназія так і не была адчынена. Верагоднай прычынай гэтага стала адсутнасць фінансавання і немагчымасць мясцовага насельніцтва ўтрымліваць установу за ўласны кошт.

Найбольш актыўна ТБШ працавала над заснаваннем беларускай гімназіі ў горадзе Глыбокім Дзісненскага павета. Першая спроба адкрыцця сярэдняй школы ў гэтым месцы адбылася 2 студзеня 1924 года, калі дырэктар беларускай гімназіі ў мястэчку Гарадок К. Тышкевіч накіраваў у Куратарыюм Віленскай школьнай акругі просьбу дазволіць перанесці гімназію з Гарадка ў Глыбокае. На пасаду дырэктара была прапанавана кандыдатура выкладчыка і інспектара Віленскай беларускай гімназіі М. Красінскага, якому Цэнтральная школьная рада ў Вільні даручыла арганізаваць у Глыбокім навучальную ўстанову. Красінскі адмовіўся, замест гэтага ён планаваў працаваць у беларускай гімназіі ў Радашковічах [27, с. 4]. Будучая гімназія павінна была знаходзіцца ва ўласным будынку Л. Дразда па вул. Сенкевіча, № 4. Дзеля гэтага гарадскімі ўладамі была арганізавана камісія, якая не дала дазвол па прычыне неадпаведнасці будынка ўмовамі размяшчэння ў ім навучальнай установы [28, с. 214].

Летам 1926 года зноў аднавіліся спробы адкрыцця беларускай гімназіі ў Глыбокім. Для гэтага Глыбоцкая акружная управа ТБШ на чале з П. Мятлой аб’явіла збор сродкаў на ўзвядзенне памяшкання. А імёны тых, хто ахвяруе больш за 10 амерыканскіх даляраў, планавалася высячы на табліцы ўнутры будынка гімназіі [29, с. 4]. У чэрвені 1926 года беларускім дзеячам удалося сабраць 311 злотых [30, с. 3]. Да збору сродкаў таксама падключыліся і беларускія эмігранты. Так, Беларускі нацыянальны саюз у Чыкага (ЗША) вылучыў 34 даляры на заснаванне беларускай гімназіі ў Глыбокім [31, с. 4]. 17 ліпеня 1926 года на карысць адкрыцця навучальнай установы ў горадзе быў арганізаваны творчы вечар. На ім адбылося прадстаўленне камедыі «Пан Міністар» Ф. Аляхновіча, дзеля якой аўтар асабіста прыехаў з Вільні і выканаў галоўную ролю [32, с. 4]. У выніку на пасяджэнні Галоўнай школьнай управы ТБШ у жніўні 1926 года было зацверджана адкрыццё 7-класнай школы, якая з цягам часу і набыццём адпаведнага будынку павінна была пераўтварыцца ў Глыбоцкую беларускую гімназію [33, с. 2]. Са справаздачы на сходзе Глыбоцкай акруговай управы ТБШ, які адбыўся 7 мая 1927 года, стала вядома, што на будаўніцтва памяшкання для гімназіі сабралі 203 даляры, што па тагачасным курсе складала каля 1 800 злотых [34, с. 4]. Аднак і дадзеная спроба не ўвянчалася поспехам. Польскія ўлады не дазволілі адкрыць новую гімназію ў Глыбокім з прычыны распачатых палітычных працэсаў над беларускімі дзеячамі ў 1927 годзе.

Спробы арганізацыі беларускіх гімназій тэрытарыяльна не абмяжоўваліся толькі паўночнай часткай Заходняй Беларусі. Восенню 1928 года з’явілася магчымасць заснавання беларускай гімназіі ў Пінску. У гэтым годзе польскія ўлады закрылі 2 рускія гімназіі (у Вілейцы і Пінску) па прычыне нізкага ўзроўню навучання. Бацькоўскі камітэт Пінскай рускай гімназіі перад закрыццём звярнуўся да мясцовага аддзела ТБШ з просьбай аб пераўтварэнні яе ў беларускую, а таксама аб канцэсіі (дазволу) на яе ўтрыманне. Па гэтай справе ад імя ТБШ у Пінск прыбыў беларускі дэпутат у польскім сойме І. Дварчанін, які павінен быў весці перамовы з Бацькоўскім камітэтам і педагагічным персаналам установы. Рашэнне пытання аб пераўтварэнні было паспяховым, засталося толькі атрымаць канцэсію ад польскіх улад. Па гэтаму пытанню на перамовы выехаў яшчэ адзін дэпутат сойма, вядомы паланафіл Я. Станкевіч [35, с. 2]. Аднак у сувязі з палітычнымі працэсамі над беларускімі актывістамі і беларускімі арганізацыямі ад ідэі адкрыцця беларускай гімназіі ў Пінску вымушаны былі адмовіцца.

**Заключэнне.** Арганізацыя беларускай нацыянальнай адукацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі на рубяжы 1910—1920-х гадоў праходзіла ў вельмі складаных абставінах. Першыя сярэднія школы — Віленская, Навагрудская, Гродзенская і Гарадоцкая — з’явіліся ва ўмовах польска-савецкай вайны з дазволу польскіх акупацыйных улад. Трэба таксама адзначыць той факт, што большасць беларускіх гімназій, акрамя ВБГ, узнікала на базе ўжо існуючых устаноў адукацыі або прытулкаў (напрыклад, Гродзенская гімназія), з якіх фарміраваўся вучнёўскі кантынгент у першыя гады іх існавання. Каардынацыю і перамовы з польскімі ўладамі па гэтых пытаннях вялі прадстаўнікі ЦБШР і ТБШ. Сама арганізацыя адбывалася часцей з ініцыятывы мясцовага насельніцтва, якое імкнулася мець сярэднія школы з беларускай мовай навучання ў сваім рэгіёне. Беларускае грамадства рабіла шматлікія захады па адкрыцці беларускіх гімназій на тэрыторыі Заходняй Беларусі, нягледзячы на тое, што паўнавартасна ў 1920-я гады працавалі яшчэ 4 гімназіі. Аднак іх усё роўна не хапала. Уплываў і геаграфічны фактар, аб чым сведчаць спробы арганізацыі ўласнай сярэдняй адукацыі на поўначы Заходняй Беларусі — у Свіры, Шаркаўшчыне і Глыбокім. Гэта было звязана з высокім узроўнем нацыянальнай свядомасці ў краі.

Паўднёвая частка заставалася без беларускай сярэдняй адукацыі. Прычыны нерэалізацыі дадзеных праектаў былі відавочнымі. У першую чаргу — адсутнасць фінансавых сродкаў. Беларускія арганізацыі не маглі неабходных велізарных сродкаў на працу гімназій. Насельніцтва, нягледзячы на жаданне адкрыцця такой установы ў сваёй мясцовасці, таксама не магло фінансава падтрымліваць гэтыя ініцыятывы. Па-другое — дзеянні польскіх улад. Адміністрацыйныя органы ўсяляк перашкаджалі ці проста забаранялі адкрываць беларускія школы, пераконваючы мясцовае насельніцтва ў неабходнасці аддаваць сваіх дзяцей у польскія школы.

Даследаванне выканана ў рамках праекта БРФФД Г24МП-012 «Беларускія гімназіі ў міжваенны перыяд: грамадска-палітычны і культурны аспекты».

### Спіс цытаваных крыніц

1. *Кахановіч, М.* Здрада ў Вільні / М. Кахановіч // Асьвета. — 1929. — № 4. — С. 118—130.
2. *Адамковіч, А.* Беларусы ў Літве: учора і сёння / А. Адамковіч. — Вільня : Т-ва беларус. культуры ў Літве, 2010. — Кн. 1 : Вільня. — 200 с.
3. *А.* 1-я Віленская Беларуская Гімназія / А. // Наша думка. — 1921. — № 21. — С. 2—3.
4. *Чэмер, А.* Наваградская беларуская гімназія / А. Чэмер. — Вільнюс : Saverenas, 1997. — 133 с.
5. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). — F. 172. Ap. 1. B. 7635.
6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). — Ф. 883. Воп. 1. Спр. 30.
7. Дваццацём мясцовасьцям Горадзенскага павета горадзенскі польскі школьны інспэктар п. Возьніцкі адмовіўскі зацьвердзіць беларускую школу, хоць там на сходах пастанавіў адчыніць беларускія школы // Незалеж. Беларусь. — 1919. — № 4. — С. 5.

8. *Чарнякевіч, А.* Старонкі гісторыі Беларускай Гародні [Электронны рэсурс] / А. Чарнякевіч. — Рэжым доступу: https://web.archive.org/web/20090725135848/http://harodnia.com/b03.php#link2 . — Дата доступу: 10.12.2023.

9. *Л. Б.* Колькі слоў аб беларускай сярэдняй школе у Горадні / Л. Б. // Беларус. слова. — 1920. — № 4. — С. 1.

10. *Тамашчык, П.* Першая Горадзенская Беларуская гімназія (для хлопцау і дзяучат) / П. Тамашчык // Наша думка. — 1921. — № 25. — С. 6.

11. З усяе Беларусі. Жыцьце Горадні // Наша Ніва. — 1920. — № 8. — С. 2.

12. Жыцьце Горадні. Беларускі прытулак і Гімназія // Беларус. слова. — 1920. — № 11. — С. 2.

13. Жыцьце Горадні. 1-я Беларуская Гімназія // Беларус. слова. — 1920. — № 2. — С. 2.

14. *Вабішчэвіч, А.* Выхаваўчай мэтай павінна служыць развіццё ў моладзі любві да Бацькаўшчыны / А. Вабішчэвіч // Куфэрак Віленшчыны. — 2001. — № 2. — С. 34—36.

15. *Кривуть, В. И.* Польские власти и белорусские школы на территории Западной Беларуси в межвоенный период / В. И. Кривуть // Традицион. нац.-культур. и духов. ценности как фундамент инновацион. развития России. — 2020. — № 2. — С. 18—21.

16. *Новік-Пяюн, С.* Гісторыя Нясвіжска-Клецкай беларускай гімназіі / С. Новік-Пяюн // Настаўн. газ. — 1995. — № 4. — С. 5.

17. Абвестка // Сялян. праўда. — 1924. — № 1. — С. 4.

18. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). — F. 172. Ap. 1. B. 5519.

19. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (LCVA). — F. 172. Ap. 1. B. 146.

20. *Казлоўскі, М.* Радашковіцкая беларуская гімназія імя Францішка Скарыны / М. Казлоўскі // Лабірынт. — 2011. — № 15. — С. 5—8.

21. Rozporządzenie Ministra Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego z dnia 3 maja 1922 r. o utworzeniu okręgu szkolnego wileńskiego // Dz. Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. — 1922. — № 34. — Poz. 283.

22. Rozporządzenie Ministra Wyznań Religijnych i Oświecenia Publicznego z dnia 24 lutego 1927 r. o zmianie granic okręgów szkolnych białostockiego, poleskiego i wileńskiego // Dz. Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. — 1927. — № 20. — Poz. 157. — S. 180.

23. *Вабішчэвіч, А.* Таварыства беларускай школы (1921—1936 гг.) / А. Вабішчэвіч // Беларус. гістар. часоп. — 1997. — № 1. — С. 86—92.

24. Віленская беларуская хроніка. Свірская беларуская гімназія // Беларус. слова. — 1920. — № 23. — С. 2.

25. Школьны аддзел. Новая беларуская гімназія // Наша думка. — 1921. — № 5. — С. 6.

26. Школьны аддзел. Кроніка // Наша думка. — 1921. — № 6. — С. 6.

27. Хроніка. З школьнага жыцьця // Сын беларуса. — 1924. — № 16. — С. 4.

28. *Krzemiński, K.* Szkoły ponadpodstawowe Naddźwinia 1919—1939 / K. Krzemiński. — Toruń : Mado, 2004. — 520 s.

29. Да ўсіх сялян беларусау і грамадзян, спрыяючых асьвеце // Нар. справа. — 1926. — № 2. — С. 4.

30. Хроніка. Падзяка // Нар. справа. — 1926. — № 1. — С. 3.

31. Белорусская жизнь в Америке // Белорус. трибуна. — 1926. — № 1. — С. 4—5.

32. Карэспандэнцыі. Беларускі спэктакль у Глыбокім // Нар. справа. — 1926. — № 5. — С. 4.

33. Życie białoruskie. Akcja szkolna // Kurjer Wileński. — 1926. — № 203. — S. 2.

34. З Таварыства Беларускае Школы. Сход Глыбоцкае Акружное Ўправы Т-ва Белар. Школы м. Глыбокае // Наша праўда. — 1927. — № 20. — С. 4.

35. Наша хроніка. Зачынілі і расейскую гімназію // Рэха працы. — 1928. — № 8. — С. 2.

Паступіў у рэдакцыю 19.03.2024.